На наш погляд, для эфектыўнай работы са студэнтамі-завочнікамі выкладчык павінен валодаць наступнымі якасцямі: імкненнем да максімальнай дакладнасці ў выкладанні сваёй дысцыпліны з прымяненнем самых розных методык адпаведна пэўнай студэнцкай аудыторыі – з базавай прафесійнай падрыхтоўкай (тэхнікум), са стажам работы і г.д.; здольнасцю да эмпатыі (разумення сямейнага становішча студэнта-завочніка, яго пачуццяў, гатоўнасці да спачування, павагі да асобы студэнта, сімпатыі); уменнем надаць выкладу матэрыялу асабістую і прывабную афарбоўку; уменнем усталяваць нефармальныя цёплыя стасункі са студэнтамі; эмацыянальнай ураўнаважанасцю; упэўненасцю ў сабе, жыццялюбствам; уменнямі ацаніць сітуацыю, з дапамогай гумару, добразычлівага жарту змяніць атмасферу, пазбегнуць непрыемных інцыдэнтаў.

Гэтыя асабістыя якасці і ўстаноўкі надаюць характэрную афарбоўку прафесійнай кампетэнтнасці педагога, а ў выніку станоўча ўплываюць на развіццё ўменняў, навыкаў і творчых здольнасцей студэнтаў-завочнікаў.

***Дуркіна Г.Р., ст. выкладчык***

## РОЛЯ СПЕЦКУРСА ПА ЛІТАРАТУРЫ Ў РАЗВІЦЦІ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ, НАВЫКАЎ І ЎМЕННЯЎ СТУДЭНТАЎ

Наступнае, XXI стагоддзе павінна стаць стагоддзем гуманітарным, стагоддзем высокай ацэнкі чалавечых каштоўнасцей. Вялікая роля ў гэтым належыць гуманітарным навукам, якія вызначаюць агульную інтэлігентнасць чалавека. Асобае месца ў гуманітарнай адукацыі мае сусветная літаратура.

У сувязі з пашырэннем культурнага руху ў нашай краіне, неабходнасцю паглыблення ведаў актуальнасць набывае пытанне аб удасканаленні сістэмы выкладання



літаратуры на ФЗН, у тым ліку форм і метадаў вывучэння літаратуры. На жаль, на вывучэнне гэтай дысцыпліны на факультэце завочнага навучання выдзелена вельмі мала гадзін, і, вядома, дасканала авалодаць названым курсам нялёгка.

Кожнае дзесяцігоддзе багатае на мастацкія адкрыцці, але ў рэгламентаваных вучэбнымі планамі рамках вельмі цяжка дасягнуць мэты, іншы раз нават няма магчымасці назваць імёны пісьменнікаў, якія ўнеслі свой уклад у развіццё сучаснай літаратуры. Таму паралельна з курсам сусветнай літаратуры ўведзены спецкурсы, якія дапаўняюць яго. Гэтыя спецкурсы павінны садзейнічаць павышэнню прафесіянальнага ўзроўню будучых спецыялістаў, развіццю мастацкай і інфармацыйнай культуры, пашырэнню іх кругагляду, далучэнню да навуковай работы. Дапаўняючы праграму асноўнага курса, яны павінны развіваць маральны стан душы, дапамагаючы тым самым студэнтам процістаяць многім хваравітым з'явам сучаснага духоўнага жыцця: бязгеройнасці і безыдэйнасці, актывізацыі масавай культуры і яе куміраў.

Мэта спецкурса, яго метадалогія ў многім вызначаюцца самой назвай. Звычайна, адной з сур'ёзнейшых праблем спецкурсаў з'яўляецца іх метадалагічная незабяспечанасць, у сувязі з чым узнікаюць пэўныя цяжкасці з адборам матэрыялу. Цяжкасці ў засваенні спецкурсаў абумоўлены і адсутнасцю вучэбнай літаратуры.

Распрацоўка вучэбных праграм па спецкурсах ажыццяўляецца адвольным шляхам, і, як паказвае практыка, у большай ступені гэтыя працэс залежыць ад спецыфікі і традыцый канкрэтнай навучальнай установы.

Прафесійная накіраванасць заняткаў на спецкурсе праяўляецца ў наступным: студэнтам даецца матэрыял прафесійна-тэарэтычнай накіраванасці; выдзяляецца абавязковы мінімум ведаў па прадмеце; фарміруецца сістэмны стыль мыслення, асноўнай рысай якога ў нашы дні стала гуманітарызацыя; выпрацоўваюцца практычныя навыкі, якія забяспечваюць эфектыўнасць будучай дзейнасці навучэнцаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнты вучацца мастацтву пошуку; ажыццяўляюцца міжпрадметныя сувязі.

Асаблівая роля ў спецкурсе адводзіцца практычным заняткам, таму што яны цесна звязаны з усімі іншымі відамі выкладання літаратуры ў вышэйшых навучальных установах. Практычныя заняткі з'яўляюцца своеасаблівым звяном у сувязі паміж лекцыйным курсам і семінарскімі заняткамі. Яны рыхтуюць студэнтаў да наступнай, вышэйшай ступені навучання.

Мэта практычных заняткаў, па-першае, – замацаваць, канкрэтызаваць, пашырыць і паглыбіць матэрыял лекцыйных курсаў; па-другое, прывіць студэнтам навыкі і прыёмы самастойнай работы і, па-трэцяе, праверыць, наколькі засвоены студэнтамі лекцыйныя курсы.

Але ёсць яшчэ адна мэта, на якую разлічаны практычныя заняткі па спецкурсе. Гэта мэта — навучыць студэнтаў самастойна аналізаваць мастацкія творы. І яна з'яўляецца галоўнай, таму што пры правядзенні лекцыйных і практычных заняткаў па асноўных курсах з-за недахопу часу гэта зрабіць немагчыма.

Працуючы самастойна над тэмай даклада для семінара або слухаючы на занятках па спецкурсе праблемнае выкладанне творчага шляху пісьменніка, студэнт апіраецца на веды, якія атрымаў на лекцыях. Калі студэнт не навучыўся аналізаваць мастацкі тэкст, то яго даклад будзе кампілятыўны, у якім адсутнічаюць самастойныя назіранні і вывады. Няўменне аналізаваць твор як адзінае мастацкае цэлае стрымлівае разуменне сур'ёзных абагульненняў, якія робяцца выкладчыкам на аснове дакладнага аналізу мастацкага тэксту.

На занятках па спецкурсе студэнты выкарыстоўваюць атрыманыя першапачатковыя навыкі па тэхніцы літаратуразнаўчай працы: зварот да бібліяграфічных матэрыялаў, пошукі неабходнай літаратуры, супастаўленне і параўнанне матэрыялаў і інш. Тут студэнты маюць магчымасць развіваць і паглыбляць літаратуразнаўчыя прыёмы вывучэння літаратуры, атрымоўваць першыя навыкі навуковай работы.

Вопыт паказвае, што студэнты, якія атрымалі добрую падрыхтоўку на малодшых курсах, пад кіраўніцтвам выкладчыка на старшых курсах могуць ствараць сур'ёзныя працы па літаратуры.

Такім чынам, асноўная мэта спецкурса – не толькі пашыраць і паглыбляць веды па прадмеце, але перш за ўсё навучыць студэнтаў самастойна думаць, аналізаваць мастацкі тэкст або літаратурны артыкул. У адваротным выпадку практычныя заняткі будуць мець чыста прыкладное значэнне – ілюстраваць і ў некаторых выпадках дубліраваць лекцыйны курс.

Вельмі важна на практычных занятках па спецкурсе не браць многа тэм і тэкстаў для аналізу (10-20 твораў). Такую колькасць можна прааналізаваць толькі абагульнена, для тэкставага аналізу не застаецца часу і магчымасцей, і ў такім выпадку тэхніцы даследавання студэнтаў немагчыма навучыць.

Заняткі па спецкурсе даюць магчымасць спалучаць праблемнасць, шырыню абагульнення матэрыялу, уласцівую лекцыйным курсам, з канкрэтнасцю аналізу тэксту, індывідуальныя формы работы з калектыўнымі, маналогі з гутаркай, дыспутам, даклады з праглядам кінафільмаў, спектакляў з далейшым абмеркаваннем. Але для іх правядзення неабходныя і строгая сістэма, і імправізацыя. Не выпадкова заняткі па спецкурсе патрабуюць і стараннага адбору матэрыялу, і кожны раз нанава прадуманай тэматыкі, новых форм і прыёмаў работы. Пытанні, якія разбіраюцца ў той ці іншай групе, могуць быць рознымі ў залежнасці ад узроўню развіцця і падрыхтоўкі студэнтаў. Аднак гэта не перашкаджае выпрацоўцы адзіных прынцыпаў падыходу да правядзення заняткаў і прымянення тых або іншых форм самастойнай творчай работы студэнтаў.

Каб накіраваць студэнтаў па шляху самастойнага мыслення, патрэбны вялікая папярэдняя праца з боку




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкладчыка, уменні правільна адбіраць матэрыял, зацікавіць студэнтаў, падвесці іх да ўсведамлення незразумелага, навучыць аналізаваць асабістыя ўражанні ад прачытанага, а таксама вучыць навучэнцаў фармуляваць пытанні, якія патрабуюць аналізу. Можна прапанаваць разгледзець супрацьлеглыя думкі, выкліканыя пэўным вобразам або творам і выказаць свае меркаванні.

Каб пазбегнуць неабгрунтаванай супярэчлівасці меркаванняў, неабходна прытрымлівацца адзінага навуковага падыходу да мастацкага твора. Пры рабоце з тэкстам задача заключаецца не толькі ў тым, каб "разабраць" твор, але і паказаць узаемасувязь усіх яго кампанентаў, адзінства твора як мастацкага цэлага. Выбар шляху аналізу залежыць не толькі ад жанравых (раман, аповесць, апавяданне) і родавых (эпас, лірыка, драма) асаблівасцей твора, але і ад асаблівасцей чытацкага ўспрымання.

У методыцы аналізу мастацкага твора ў вышэйшых навучальных установах і школьнай практыцы суіснуюць тры асноўныя шляхі літаратурнага разбору: цэласны, "па вобразах" і праблемны. Кожны са шляхоў аналізу мае свае плюсы і мінусы. Цэласны аналіз тоіць "небяспечнасць растварэння ў тэксце", перашкаджае выхаду да агульнай канцэпцыі твора. Аналіз "па вобразах" скампраметаваны ў школьнай практыцы, прымянясцца няправільна, адводзіць ад цэласнага ўспрымання твора. Для вывучэння твора ў вышэйшай навучальнай установе перавага аддаецца праблемнаму аналізу, але і ён мае свае недахопы: можа прывесці да "адрыву" ад твора, у сферу абстрактных ідэй замест непасрэднага эстэтычнага перажывання тэксту.

Аднак праблемны аналіз, які актывізуе студэнтаў, дапамагае ставіць і вырашаць сур'ёзныя пытанні творчай дзейнасці пісьменніка, развіцця літаратуры ў пэўны час.

Такім чынам, аналіз тэксту па сваіх формах вельмі markedly розна бакoвы.

разглядаць тэкст як стварэнне мастака, як параджэнне яго розуму, фантазіі, прадстаўленае ў пэўнай літаратурнай тэхніцы. Структуралізм дапамагае выявіць спецыфічны змест тэксту як факту мастацтва. Перш за ўсё ўвага звяртаецца на спосабы яго стварэння, сучлянення ў ім канструктыўна-лагічных частак. Структуралізм як метад мала апіраецца на непасрэднасць чытацкага ўспрымання. Увага да самай дробнай адзінкі тэксту, даследаванне яе мнагазначных сэнсаў, розных адценняў, звязаных з яе функцыянаваннем у тэксце, багацце заключанай у ёй інфармацыі могуць садзейнічаць больш дакладнай матывацыі літаратуразнаўчага аналізу.

Аналізуючы творы ў час заняткаў па спецкурсе, студэнты вучацца знаходзіць той патрэбны ключ, які дапамагае раскрыць творчую задуму пісьменніка. Гэта вымушае студэнтаў творча падыходзіць да вывучаемага матэрыялу, грунтоўна рыхтавацца да заняткаў. Ад выкладчыкаў таксама патрабуюцца і творчы падыход, і эрудыцыя, і грунтоўная падрыхтоўка да заняткаў.

Спецкурс – складаны працэс узаемадзеяння выкладчыка літаратуры і студэнтаў. Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгрывае асоба выкладчыка, рознабакова падрыхтаванага, захопленага прадметам, патрабавальнага і добразычлівага, зацікаўленага ў навучанні і выхаванні студэнтаў.

*Жынкевіч Т.І., выкладчык*

## СТЭРЭАТЫПЫ ЗРОКАВАГА ЎСПРЫМАННЯ НОТНАГА ТЭКСТУ СТУДЭНТАМІ ФЗН

Прафесіянальная музычная адукацыя студэнтаў факультэта мастацкай творчасці ў сістэме выканальніцкіх дысцыплін заснавана перш за ўсё на рабоце над музычным творам. Працэс работы над музычным творам, яго





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ